Культура зніклай вёскі

(даследчая праца)

Адамовіч Іван, вучань 11 “А” класа

навуковы кіраўнік – Адамовіч Тацяна Яраславаўна, настаўніца беларускай мовы

Чалавек, які не ведае гісторыю свайго роду, сваёй зямлі не можа быць па-сапраўднаму шчаслівым, бо ён страчвае самае каштоўнае ў жыцці – духоўнае багацце.

Беларуская культура шмат страціла за вякі сваёй трагічнай гісторыі. Тым не менш, кожны куток на Беларусі яшчэ не страціў сваю самабытнасць і непаўторнасць. Адметнасць культурнай прасторы стварае своеасаблівы вобраз свету, у якім фарміруецца духоўны воблік чалавека. Надзвычай важна, каб кожны ўжо змалку адчуваў і ўсведамляў сябе носьбітам і спадкаемцам культурнай традыцыі, якая складвалася ў той ці іншай мясцовасці на працягу стагоддзяў. А гэта стане магчымым тады, калі мы, падлеткі, будзем спасцігаць не толькі гатовыя веды пра сваю зямлю, але сур’ёзна зоймемся пошукавай і даследчыцкай працай па вывучэнні свайго краю[1.5].

Калі я прыязджаю да сваёй бабулі ў вёску Сасноўшчына, то часта прысутнічаю пры гутарцы вяскоўцаў, якія прыходзяць “на сяло”. Адразу перада мною ўзнікаюць малюнкі мінулага жыцця людзей, якія насяляюць вёску. Але найбольш мяне цікавіць той час, калі яны былі жыхарамі зніклай у 1958 годзе вёскі Вузляны.

Тады, калі глядзеў на вяскоўцаў, я разумеў, што сярод іх усё менш застаецца жыхароў той зніклай вёскі. Таму з’явілася жаданне занатаваць іх успаміны пра быт, традыцыйную культуру, абрады і звычаі, рамёствы і мастацкую творчасць. Я захацеў атрымаць поўныя веды аб мясцовасці, дзе нарадзіўся і правёў сваё дзяцінства мой дзядуля, мае прабабуля і прадзядуля, якога выносілі на могілкі менавіта з той беднаватай вузлянскай хаты, якую

потым перавезлі ў новую вёску; вызначыць адметнасць і самабытнасць культурнага асяроддзя, якое акружала жыхароў Вузлян.

Гістарычная памяць, без якой не можа быць паўнацэннага народа, пачынаецца з натуральнага імкнення чалавека пазнаць самаго сябе, з жадання даведацца, хто і адкуль ён. Існуе паданне, што ў нашых продкаў быў такі звычай. Калі юнак дасягаў паўналецця і мог звацца мужчынам, ён мусіў выканаць чатыры выпрабаванні: пераплысці паўнаводную раку, упаляваць зубра ці мядзведзя, раскласці вогнішча і назваць сваіх продкаў да пятага калена. Чалавеку, які не ведаў сваіх продкаў, не давяралі, лічылі здольным да здрады.

Таму свой пра свой род я пачну апавядаць з гісторыі роднай вёскі. У 1934-1936 гадах яе рассялілі па хутарах, а ў 1956 годзе пачалося перасяленне з хутароў, якое закончылася ў 1958 годзе.

Вёска Вузляны, на маю думку, так называлася, бо была вузкаю і мела толькі адну вуліцу. Потым гэту вёсачку рассялілі па хутарах, якія былі аб'яднаны пад той жа назвай, што і вёска. Хутар аднаго гаспадара размяшчаўся за 400-500 метраў ад гаспадаркі іншай сям'і. Па ўспамінах жыхароў, сістэмы ў рассяленні не было: сваякі маглі знаходзіцца па розныя бакі вёскі. Растлумачыць, чаму так было, на жаль, няма каму, бо сведкаў дадзенага рассялення не засталося ў жывых. На маю думку, гэта могло залежаць ад матэрыяльнага становішча сям'і: хто быў багацейшы, той плаціў за лепшы надзел зямлі.

У вёсцы пражывала ўсяго 47 сямей, сярод якіх былі і сваякі, і жыхары з аднолькавым прозвішчам. Дзесяць сямей з прозвішчам Лазавік, шэсць – Навойчык, па пяць – Сяржант і Барташонак, чатыры – Місун, па дзве сям'і з прозвішчамі Аўгусціновіч і Панарад, і па адной – Шкель, Віркоўскія, Атрошка, Стукін, Гапановіч, Ляшковіч, Вайцяшонак, Тонкавіч, Атрошчык, Юрэвіч, Ляўко, Чачык і Язневіч.

Лёс кожнай сям'і склаўся па-рознаму. Сям'я Ляшковіча Івана Фадзеевіча была рэпрэсавана ў 1939 годзе, бо ўлады палічылі іх кулакамі. Па ўспамінах

аднавяскоўцаў, гаспадарка Ляшковіча вылучалася багаццем. Падмурак ў хаце быў каменны. Сама хата – высокая і вялікая. Зямля ў гаспадара – добрая: чорная і ўрадлівая. Надзел размяшчаўся воддаль ад іншых гаспадарак. Але наёмнай працай Ляшковічы не карысталіся[2.253]. Прапаў Барташонак Іван, які выказаў незадавальненне існуючым парадкам. Аднавяскоўцы кажуць, што данёс на яго Місун Пётра, якога потым застрэліў даўгінаўскі яўрэй Палант. Прычына невядома, але, мяркуюць, таксама пагражаў раскрыццём "нейкіх сакрэтаў". Жыхары вёскі недалюблівалі Пётру і пабойваліся.

У Вузлянах да рассялення быў свой калгас, які праіснаваў толькі 2-3 гады (дзесьці з 1949 да 1953). Потым усе вяскоўцы ўвайшлі ў калгас вёскі Даўгінава. Першым вузлянскім старшынёй быў Навойчык Сцяпан (меў мянушку Каваль, бо быў кавалём), намеснікам быў абраны Місун Мікалай Мацвеевіч, рахункаводам – Каляга Алена.

Пасля рассялення хутароў у 1956-1958 гадах у вёску Апенькі пераехала сям'я Гапановіча Ігната, у Даўгінава – сем'і Віркоўскай Ганны, Барташонка Ігната, Аўгусціновіча Аляксандра, Ляўко Сяргея. А большасць жыхароў пераехала ў былы маёнтак пана Дубашчынскага – Сасноўшчыну. Пасля перасялення некалькі сямей выехала жыць у Польшчу і Літву.

Рассяляліся жыхары па жаданні: кожны выбіраў вёску, дзе жылі сваякі. Па веравызнанні пераважалі праваслаўныя, было шмат мнагадзетных сямей (ад 5 да 14 дзяцей). Напрыклад, мая прабабуля мела дзевяць дзяцей. У той час яна ўжо страціла мужа і падымала дзяцей адна. На пераезд былі выдаткаваны грошы з калгаса, якія потым вяскоўцы адпрацоўвалі.

У прыродзе восень змяняецца зімою, зіма – вясною, вясна – летам… Кругаварот існуе не толькі ў прыродзе, але і ў жыцці чалавека. Вёсачка Вузляны ў сваім паўсядзённым быце была нічым не адметная ад іншых вёсак Беларусі. Мужчыны з рання да вечара працавалі ў полі ад вясны да зімы: вясною аралі зямлю, кідалі зерне ў глебу, назіралі за ўраджаем і з задавальненнем яго збіралі. Зімою ж абавязак мужчын – даглядаць жывёлу.

Жанчыны праводзілі ў полі даволі шмат часу: дапамагалі сеяць збожжа,

убіралі лён, жалі жыта, дапамагалі мужчынам нарыхтоўваць сена. Займаліся збіральніцтвам цэлае лета. Пра аздабленне хаты забываліся аж да зімы. За парадкам у хаце сачылі дзеці. Але перад святам ва ўборцы ўдзельнічалі амаль усе члены сям'і.

Вясною, калі пачынаўся пасеў, гаспадар з гаспадыняй ішлі ў поле з грамнічнай свечкай, вербачкамі і боханам хлеба. Абыходзілі свой надзел з малітваю і вярталіся дадому. Пачыналі садзіць пасля старэйшага гаспадара ў вёсцы. Лічылі, што ён лепш ведае пра пару для сяўбы. Некаторыя мужчыны ішлі ў поле, закатвалі рукавы ватоўкі і рукі засоўвалі як мага глыбей у глебу. Рукі трымалі некалькі хвілін. Калі было холадна ў рукі – садзіць рана.

На Юр'е, 6 мая, выганялі жывёлу на пашу, якую пасвілі дзеці.

Лета – гэта пара касавіцы, уборкі лёну і збожжа. Зажынкі агульнымі не былі. Кожны гаспадар выбіраў свой час для зажынак. У поле ішла гаспадыня з сярпом, жала першы невялічкі сноп, які называлі " гаспадаром" і ставілі яго на покуць. На тым месцы, дзе быў зжаты сноп, закопвала гаспадыня кавалачак хлеба, каб быў добры ўраджай. А на другі дзень пачыналася жніво.

Паняцце "талака" ў зніклай вёсцы існавала ў дачыненні да наступных спраў: талакою мялі лён, малацілі зерне. Талакою збіраліся не толькі сваякі, а амаль усе вяскоўцы (больш жанчыны), якія хадзілі ад хаты да хаты і працавалі ў гумне.

Зімою жанчыны апраналі сям'ю: пры лучыне пралі, потым ткалі, вышывалі, дзяўчаткі ім дапамагалі: рыхтавалі сабе пасаг.

Хоць у бліжэйшай вёсцы Даўгінава на той час існавала амаль 7 хлебапякарань, хлеб кожная сям'я выпякала сама. У кожнай хаце была дзяжа, бо сорамна пазычаць. Перад выпечкай гаспадыня чытала малітву і рыхтавала ручнік, які называлі "надзежнік", бо клалі яго на дзяжу. У нашай вёсцы "надзежнікі" былі без вышыўкі, але з аднаго боку ручнік аздаблялі сплеценымі коскамі. У другой справе ніколі гэты ручнік не выкарыстоўвалі.

Хаты вяскоўцаў аздобай не выдзяляліся: падлога – з гліны, вокны – без фіранак. Але на святы (Вялікдзень і Каляды) на вокны чаплялі папяровыя

фіранкі, а ў каго была марля, то рабілі фіранкі з яе. З паперы ці з марлі выразалі розныя ўзоры і дадзены выраб вешалі на вокны.

У кожнай хаце стаяла аднолькавая мэбля: стол, лавы, табурэткі, якія перад святам выносілі да сажалак, што знаходзіліся амаль ля кожнай хаты, і шкраблі да бляску. Дагэтуль захавалася сажалка, якая размяшчалася каля хаты Ляўко Сяргея. Яе так і называюць – Ляўкова. Астатнія былі знішчаны, бо асушэнне праведзена і ў тым месцы, дзе праходзіла вёска.

Жыхары вёскі хадзілі на працу да паноў або па суботах у Даўгінава да яўрэяў, якія ў гэты дзень не працавалі. Па Талмуце ім у суботу можна было зрабіць толькі 400-450 крокаў, таму маглі схадзіць толькі ў сінагогу і крыху пашпацыраваць. Для працы яны наймалі беларусаў.

Вясковыя дзеці хадзілі ў пачатковую школу ў Апенькі. Там вучыліся чатыры гады. Прадметы выкладаліся на беларускай і польскай мове да 1939 года, а потым – толькі на беларускай. Вывучалася і руская мова і літаратура як прадмет. Потым у 5 клас паступалі, здаючы іспыты, у Даўгінава. Да 1939 года ў школе праводзіліся ўрокі праваслаўнымі і каталіцкімі святарамі[3].

Яшчэ са школы вяскоўцы засвоілі, што ёсць святы хрысціянскія і язычніцкія, таму ў вёсцы Вузляны больш пераважалі хрысціянскія святы. Напрыклад, ніколі не святкавалі Купалле. Толькі пасля перасялення і аб’яднання ў саўгас сталі святкаваць, таму што свята праводзілі работнікі культуры.

Вялікія святы нашай зніклай вёсачкі былі звязаны са звычайным царкоўным каляндаром. Вялікдзень, Благавешчанне, Радуніца, Тройца, Спас, Пакровы, Дзяды, Каляды (Раство Хрыстова) і іншыя вялікія святы і прысвяткі, а таксама пасты праводзілі вяскоўцы як і паўсюдна на Беларусі.

Перад Вялікаднем да чацвярга, які называюць Чысты чацвер, старанна прыбіралі ў хаце, мыліся ў лазні. А ў суботу зранку завешвалі на вокны папяровыя фіранкі (калі яны былі), на абразы – набожнікі, замешвалі ў дзяжы цеста на пірагі і з абеда распальвалі ў печы. Кожная гаспадынька рыхтавала

святочныя стравы: смажыла мяса, каўбасу, варыла цыбульнае шалупінне і фарбавала ў яго адвары велікодныя яйкі.

У суботу прыходзіла старэйшая жанчына са сваякоў і пыталася ў дзяцей: ці не елі што з мяса. Калі хто еў, то пужалі падпеччам. Была добрая традыцыя адорваць адзін аднаго на Вялікдзень святочнымі яйкамі. Вечарам з кожнай сям'і людзі ішлі ў храм на ўсяночную. З сабою бралі пірог, яйкі, соль, хлеб. Набажэнствы ў гэту ноч заканчваліся гадзін каля чатырох. На заканчэнне ўсяночнай святары асвячаюць пасху.

Раніцай мыліся вадой, у якую клалі чырвонае яйка і залатыя ці сярэбраныя прадметы, каб быць увесь год чыстым і здаровым (чырвоным і гладкім, як яйка). Кожная гаспадыня накрывала святочны стол, за які, папярэдне памаліўшыся Богу, садзіліся, каб разгавецца. Толькі цяпер упершыню пасля доўгага сямітыднёвага посту можна было ўволю паласавацца рознымі стравамі. Есці пачыналі з асвечанага яйка, солі і хлеба.

Самая любімая гульня на Вялікдзень – біткі. Стукаліся святочнымі яйкамі, і пераможцам аказваўся той, у каго яно заставалася цэлым. Гаспадар “мацака” забіраў сабе разбітыя яйкі іншых удзельнікаў гульні. Яшчэ гулялі з яйкамі, качаючы іх. Быў зроблены спецыяльны латочак, па якім пускалі яйка. Чыё далей пакоціцца, той перамагае і забірае яйкі астатніх удзельнікаў гульні.

Катэгарычна забараняліся на Вялікдзень бойка і сваркі. Мужчыны і хлопцы збіраліся ў вялікія, чалавек да 10-20 гурты валачобнікаў, сярод якіх абавязкова прысутнічаў механоша, астатнія называліся падхватнікамі, іх суправаджала музыка. Валачобнікі абыходзілі ўсе мясцовыя двары, спыняючыся пад вокнамі кожнага дома, дзе спявалі “васолы”, пераважна велічальнага зместу, услаўляючы гаспадара, яго руплівую працу, жадаючы яму ўраджаю на ніве, прыплоду ў хляве, прыбытку ў хаце. Хвалілі валачобнікі і гаспадыню за яе працавітасць і розум. Добрыя словы гучалі ў адрас дзяцей. Валачобнікаў гаспадары адорвалі падарункамі: салам, каўбасамі, сырам і абавязкова чырвонымі яйкамі. З другога дня Пасхі кожная

сям’я наведвала сваякоў і суседзяў. І гэтыя завітанні ў госці працягваліся цэлы тыдзень (Праводніца), на працягу якога нічога не рабілі. З першага дня свята і да Узнясення віталіся: “Хрыстос уваскрэс!”

Яшчэ адным вялікім святам лічыліся Каляды (Раство Хрыстова). Хоць у вёсцы жылі людзі рознага веравызнання, але павага да свята была аднолькавая. Калі святкавалі Каляды каталікі, праваслаўныя некалькі дзён устрымліваліся ад працы, так і каталікі рабілі перадых ад працы ў час праваслаўных Калядаў. Напярэдадні свята ў кожнай хаце гатавалі святую вячэру. Рыхтавалі куццю і пяклі бліны, а ўвогуле на стол ставілі як мага больш посных страў. Святкаваць пачыналі з узыходам на небе першай вячэрняй зоркі.

Святочныя застоллі праходзілі як у коле сям'і, так і з запрашэннем у госці іншых сваякоў. З гэтага ж дня, вечарам, пачыналі хадзіць калядоўшчыкі з абрадамі слаўлення і добрых зычэнняў гаспадарам і членам іх сямей. Звычайна пераапраналіся толькі ў “казу”, але магічнай сілы ёй не надавалі. Яна была толькі для аздаблення, для весялосці.

Другая куцця (Багатая) адзначалася на шчодры вечар – 13 студзеня, якраз пад Стары Новы год. Пасля вячэры моладзь варажыла і “цягалі вароты”– падказвалі бацькам, з кім сустракаюцца іх дзеці, і папярэджвалі, што трэба рыхтавацца да вяселля.

Ад Дня Нараджэння Хрыстова да 21 студзеня вечарамі нічога не рабілі, нават не ткалі, гэтыя вечары называлі святымі. Калядныя вечары вызначаліся яшчэ ігрышчамі і вячоркамі, на якія збіралася ў асноўным моладзь. На працягу ўсіх Каляд дзяўчаты гадалі аб будучым замужжы і сваёй долі.

Як і ў кожнай вёсцы, у Вузлянах збіраліся на вячоркі. Звычайна ў халоднае надвор’е выбіралі самую большую хату ў вёсцы. Летам жа добра было праводзіць гулянне і на ўлонні прыроды. На вячорках прысутнічала пераважна моладзь, якая спявала, танчыла. Дзяўчаты часта бралі з сабой нейкую ручную работу: кудзелю, вышыванне, вязанне і іншае. Музыканты былі са сваіх: гарманіст (Навойчык Андрэй) і скрыпач (на жаль, прозвішча не

маглі вяскоўцы ўспомніць). Часта пасля вячорак хлопцы біліся, асабліва калі прыходзілі кавалеры з іншай вёскі. На запытанне: навошта трэба было біцца? – былыя вяскоўцы адказваюць: бо напіваліся. Паміж аднавяскоўцамі ніколі не было спрэчак, а вось калі вёска паміж вёскаю – то, бывала, біліся. Вячоркі ніколі не праводзіліся ў пост, напярэдадні хрысціянскіх святаў, калі забаранялі святары.

Сярод вяскоўцаў вялікіх майстроў-рамеснікаў можна назваць каваля - Навойчыка Сцяпана, якога часцей звалі Кавалём. Дзяцей яго таксама клікалі Кавалёвымі: Ганна Кавалёва. Майстар быў добры, але пасля перасялення ў кузні не працаваў, бо стаў брыгадзірам. Жыхары вёскі ж пачалі хадзіць у кузню ажно ў Даўгінава. Потым з'явіліся свае кавалі сярод маладзейшых: Лазавік Андрэй і Закалінскі Мечыслаў, якім праца вельмі падабалася, а людзі хвалілі іх вырабы: сякеры, косы, абручы, падковы і інш. Асноўнымі відамі работ былі акоўка транспартных сродкаў (калёсы, сані), падкоўка коней, выраб сельскагаспадарчага інвентару, слясарнага і сталярнага інструменту, прыладаў хатняга ўжытку, дэталяў аснашчэння жылля і мэблі (ручкі, завесы, клямкі і г.д.).

Жанчыны займаліся ткацтвам і вышыўкай. Кросны былі амаль у кожнай хаце. Авечак стрыглі ўвосень і ўвесну, часалі воўну на грабянцах, пралі і ткалі. Каб атрымаць сукно, з якога шылі верхняе адзенне, тканіну валялі.

Для аздаблення хаты стваралі вырабы з саломкі: шкатулкі, цацкі, павукі, упрыхожанні для ікон. Таксама з саломы выраблялі сявенькі, корабы. У кожнай хаце быў свой майстар, бо, каб вяскоўцы лічылі цябе добрым гаспадаром, трэба было ўсё ўмець[3].

З перасяленнем многае змянілася ў быце і традыцыях былых жыхароў вёскі Вузляны. Хаты стаялі побач, можна было назіраць, які гаспадар жыве па-суседству, таму сталі імкнуцца да "цывілізацыі". Зніклі папяровыя фіранкі, паступова замянілі іх купленыя ў яўрэяў фіранкі з цюлю. Усе сталі працаваць у калгасе, на хатнія рамёствы не хапала часу. Многія вырабы

пачалі купляць у крамах або манапольках, якія яшчэ існавалі ў Даўгінаве. Потым ў вёсцы Сасноўшчына з'явіўся свой магазін.

У кожнай хаце ўжо была падлога з дошак. Пачалі прыбудоўваць веранды, якія прываблівалі погляды сваімі вокнамі, з прыгожымі рамамі.

Па-ранейшаму збіраліся на вячоркі. Сталыя людзі хадзілі "на сяло". Звычайна абмяркоўвалі падзеі, якія адбываліся ў свеце.

Паняцце "талака" доўгі час не знікала, бо талакою выбіралі бульбу, працавалі ў касавіцу.

З вялікім размахам пачалі святкаваць Купалле, Свята працы, Дажынкі. Ладзілі святы звычайна культработнікі. Жыхары рэдка калі напіваліся, вучыліся збіраць кожную капейку.

Цывілізацыя прынесла вялікія змены ў быт вяскоўцаў, але нельга сказаць, што культура і традыцыі багацелі і захоўваліся. Сёння мала хто можа сплесці добры кош, зрабіць нож. Наогул, па маіх назіраннях, зніклі мужчынскія майстэрствы. Жанчына яшчэ можа пашыць, вышыць, а вось мужчыны…

Кожны чалавек прычыны сваіх няўдач шукае не ў сабе, а ў тым, што не ў той час нарадзіўся, не ў той час ахрысціўся. Час… Ён мяняецца, бяжыць. Мы не паспяваем за ім. Многа губляем, потым плачам. Можа, не трэба спяшацца, а жыць сваім сумленнем, выкарыстоўваючы і захоўваючы традыцыі і мудрасць нашых продкаў.

Ёсць выказванне: "Калі людзі стваралі наскальныя малюнкі, яны былі нецывілізаваныя, але культурныя. Сёння мы вельмі цывілізаваныя, але нам не хапае культуры".

Жыхары зніклай вёскі Вузляны часта ўспамінаюць, як яны жылі бедна, але шчасліва. Сёння яны бачаць шмат чаго добрага ў жыцці: інтэр'ер хат змяніўся, адзенне сталі насіць прыгожае, моднае, стравы на сталах сталі больш разнастайнымі. Але не хапае песень, якія гучалі вечарамі за калаўротам на гучных вячорках. Засталіся жыць толькі некаторыя традыцыі: на Вялікдзень спяваюць васолы; на Каляды рыхтуюць святочную вячэру з дванаццаці посных страў; на Яна збіраюць 12 зёлак, каб асвяціць у царкве; на

Вербную ўпрыхожваюць вербачку... Менавіта ў гэтыя святы збіраюцца за агульным сталом і ўспамінаюць, як было раней. Тады гучыць песня з той вёскі і танцуецца танец “Чабірайка”, які бытаваў у Вузлянах.

Цікава назіраць за ўсім гэтым і вельмі хочацца захаваць культурныя традыцыі продкаў, каб і іншыя пакаленні маглі пазнаёміцца з імі...

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Беларусазнаўства, 8-9 класы, зборнік № 3./ Склад. А.Ю.Лозка, Т.А.Арлова і інш.—Мн.: Рэкл.-выд.агенцтва “Азбука”, 1993.—128 с.
2. Памяць: Гіст-дакум. хроніка Вілейскага раёна.—Мн.: БЕЛТА, 2003.—704 с.: іл.
3. Сямейны архіў. Успаміны жыхароў зніклай вёскі Вузляны: Каляга А.П. (дзявочае прозвішча Барташонак), Місевіч Т.І (дзявочае прозвішча Барташонак).